Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 35 (292)

■ Дата

«КУЛЬТУРНЫ» СПЛАЎ МАЛАДОСЦІ І ТАЛЕНТУ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў адзначае 40-годдзе з дня заснавання.

Фота Канстанціна ДРОБАВА.

У адной з галоўных творчых ВНУ краіны адбываюцца ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды круглай даты. Адно з іх шэрагу прайшло днямі на малой сцэне Палаца Рэспублікі, дзе сустрэліся людзі, лёс якіх так ці інакш звязаны з універсітэтам.

— Насамрэч, першы корпус тады яшчэ Інстытута культуры адкрыўся раней, 6 кастрычніка 1975 года, — распавядае **першы прарэктар БДУКМ Аліна КОРБУТ.** — І сённяшнее мерапрыемства — толькі адно з ліку тых, што мы запланавалі. Некалькі дзён таму адбылося пасяджэнне вучонага савета. Неўзабаве пройдзе навуковая канферэнцыя, прымеркаваная да гэтай падзеі. Сёння ж адбудзецца ўрачыстае ўшанаванне і ўзнагароджанне нашых вядучых супрацоўнікаў, людзей, якія шмат зрабілі для развіцця адукацыі і культуры ў Беларусі. У госці да нас прыйдуць выкладчыкі ўніверсітэта, як цяперашнія, так і ветэраны; студэнты; прадстаўнікі ўстаноў, з якімі мы цесна супрацоўнічаем. А ў падарунак усе атрымаюць канцэрт, падчас якога выступяць нашы студэнцкія калектывы.

— Гісторыя нашай вельмі маладой па сусветных мерках установы — гэта гісторыя паступовага развіцця, стварэння новага, — падзяліўся думкамі **рэктар універсітэта культуры і мастацтваў Юрый БОНДАР.** — Мы з аптымізмам глядзім і ў наступныя 40 гадоў. Універсітэт імкнецца адэкватна рэагаваць на патрэбы грамадства, на спецыфіку постіндустрыяльнай эпохі. Але галоўнае — у нашай краіне, як і раней, вельмі шмат таленавітай моладзі, якой мы дапамагаем знаходзіць сябе і развівацца. Конкурс у БДУКМ застаецца стабільна высокім, на некаторыя спецыяльнасці — да пяці чалавек на месца; студэнты прыходзяць матываванымі да вучобы, а ў краіне цяжка знайсці ўстанову, дзе не працавалі б нашы выпускнікі. Ды і творчыя дасягненні ўніверсітэта цяжка не заўважыць. Напрыклад, летась адбылася прэм'ера мюзікла «Дуброўскі», створанага намаганнямі нашых студэнтаў. Цяпер прыступаем да рэалізацыі яшчэ аднаго маштабнага праекта, таксама мюзікла. Спадзяюся, гэтыя тэндэнцыі захаваюцца і надалей.

Афіцыйная цырымонія ўзнагароджання распачалася з агучвання віншавання кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі, якое прысутным зачытаў міністр культуры Барыс Святлоў (дарэчы, у мінулым — рэктар БДУКМ). Падзякі ад Міністэрства культуры супрацоўнікам універсітэта ўручаў намеснік міністра Аляксандр Яцко, ад Міністэрства адукацыі — першы намеснік міністра Вадзім Богуш. Павіншавалі ВНУ і сталічныя дэпутаты ў асобе старшыні Мінгарсавета Васіля Панасюка. Не магла не крануць прысутных прамова акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандра Кавалені, які ўзгадаў, як стваралася навучальная ўстанова. А выпускнік інстытута культуры 1983 года, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, перадаў у бібліятэку БДУКМ першыя тамы факсімільнага выдання «Кніжная спадчына Францыска Скарыны».

Завяршаў свята канцэрт, які падрыхтавалі студэнты розных спецыяльнасцяў універсітэта. Спевы і танцы — у такой кампаніі бавілі вечар госці. Сімвалічна, што вядучымі канцэрта былі выпускнікі ўніверсітэта культуры і мастацтваў — тэлевядучая Вольга Рыжыкава і спявак Тэа (Юрый Вашчук).

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

■ Вернісажы

ПАРЫЖСКАЕ ПАВЕТРА ВОСЕНЬСКАГА МІНСКА

Вішанькі, яблыкі і іншыя смакі для цывілізаванага арт-рынку

Дзякуючы славутым парыжскім мастацкім салонам пачатку XX ст. свет адкрыў безліч творцаў, імёны якіх вядомыя ва ўсім свеце, а творы прадаюцца па ашаламляльных коштах. Цяпер ёсць магчымасць зрабіць падобныя адкрыцці ў Беларусі: у сталічным Палацы мастацтваў праходзіць першы (!) у краіне «Асенні салон з Белгазпрамбанкам», дзе кожны малады мастак мае шанц быць адкрытым, а кожны глядач — магчымасць набыць твор мастацтва.

Таму што гэта выстава, дзе ля карцін разам з подпісамі пазначаны кошт. Але прадаецца не ўсё: ёсць творы тых самых знакавых для Беларусі мастакоў Парыжскай школы. Яны знаходзяцца ў карпаратыўнай калекцыі «Безгазпрамбанка»: творы Шагала, Суціна, Кікоіна, Бакста і іншых мастакоў. Як не пайсці паглядзець, напрыклад, на «Лунаціка» Марка Шагала ці «Ноч на святога Іаана» Дзмітрыя Сцялецкага, «Гарадскі пейзаж» Восіпа Любіча, якія дэманструюцца ўпершыню? Ужо гэта — сенсацыя. Яшчэ адна: разам, у гэтай жа прасторы, выстаўляюцца сучасныя беларускія мастакі. Наша сёння і наша заўтра: ім да 40 гадоў. І хто ведае, ці няма сярод іх талентаў, якія, можа быць, не адчуваюць да сябе належнай увагі з боку айчыннай публікі, але вартыя яе? Дзеля таго, каб трапіць на выставу, яны праходзілі праз конкурсны адбор. Напачатку было прадстаўлена 800 прац ад 300 творцаў. І ўсё гэта прадаецца — і жывапісныя палотны, і графічныя работы, нават скульптуры! Цэны кожны аўтар выстаўляў сам. Але падчас выставы будзе ісці і галасаванне за найбольш цікавыя творы. Таму, нават калі нехта не можа ўласна грашыма падтрымаць мастака, то ён здольны паўплываць на вынік яго ўдзелу ў выставе: прызавы фонд складае 25 тысяч еўра.

Грашовы кірунак мае сэнс яшчэ і таму, што падчас гэтай выставы арганізатары імкнуцца прыцягнуць увагу да такой загадкавай з'явы, як «арт-рынак» Беларусі. Тое, без чаго немагчымы сучасны мастацкі працэс: таму што мастакі ў цывілізаваным грамадстве не павінны быць галоднымі, яны могуць зарабляць на сваіх творах. Адпаведна, патрэбны людзі, якія б маглі за гэта заплаціць і разумелі, з чаго складаецца гэты кошт. Таму ў рамках «Асенняга салона з Белгазпрамбанкам» на «круглым стале» абмяркоўвалася тэма існавання калекцыянераў у Беларусі. Некаторыя з іх нават былі гатовыя адкрыта (што бывае даволі рэдка) гаварыць пра асаблівасці сваіх калекцый.

Старшыня праўлення «Белгазпрамбанка» Віктар БАБАРЫКА:

— Калекцыянер — гэта звычайна фізічная асоба. У нашым выпадку, наадварот, калекцыю стварае юрыдычная асоба. Пачалося з нашай працы ў сацыяльным кірунку, дзе адным з праектаў стаў «Арт-Беларусь». Мы прыйшлі да пытання: што ж можна ў Беларусі збіраць, чым краіна можа ганарыцца? Дапамагла вызначыцца кніга Уладзіміра Шчаснага «Мастакі парыжскай школы з Беларусі». Гэта пласт мастацтва, які ведае ўвесь свет. Але паўстала тэма вяртання культурнай спадчыны. Пайшла тэхнічная праца па выяўленні тых знакамітых творцаў, якія з'яўляюцца выхадцамі з Беларусі, твораў якіх няма ў нашай краіне. Фактычна ўся наша калекцыя з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю. Яе сэнс у тым, што мы запаўняем лакуны. Уявіце сабе, што ў Беларусі да гэтага часу не было б Шагала, Суціна, Кікоіна? Тут што ні вяртай — усё радасна вітаюць. У гэтым і вялікі мінус: калекцыя эклектычная.

Але мы парушылі ўяўленне пра калекцыянераў: усё, што мы збіраем, «Белгазпрамбанку» не трэба, мы гэтага не хаваем. Наша калекцыя — гэта, груба кажучы, — вішанька на торце. Але павінна быць аснова, торт, каб яго ўпрыгожыць гэтымі вішанькамі. Каб працы Баброўскага, якога ўсе ведаюць, але твораў не бачылі, ці Рушчыца, яго беларускія пейзажы, заігралі б. Усе гэтыя творы глядзяцца ў рамках вялікіх выстаў, як праект «10 стагоддзяў мастацтва Беларусі». Мы набылі сёлета 4 цудоўныя творы Бакста, якіх не было ў Беларусі. Але каб прадставіць іх, патрэбна супрацоўніцтва з іншымі калекцыянерамі, дзеля паўнавартаснай выставы. Таму я прапаноўваў бы нас разглядаць не як калекцыянера, а як партнёра: давайце разам зробім справу, якая б упрыгожыла культурнае жыццё нашай краіны, каб людзі потым казалі: «Ваў!» Наша мэта ў прасоўванні беларускага мастацтва ў жаданні — рабіць «ваў-эфект». Мы маем магчымасць набываць рэчы для гэтага. Але для гэтага патрэбна аснова і супольная праца.

Калекцыянер і мастак Андрэй ПЛЯСАНАЎ, які падчас вучобы на рэжысёрскім факультэце Тэатральна-мастацкага інстытута пазнаёміўся з Цэслерам, Малішэўскім, Хацкевічам, Сурыновічам, Сазыкінай, Глобусам і яшчэ сотняй супермастакоў (так ён лічыць), расказвае:

— Адбіраю творы з пункту гледжання таго, што мне падабаецца, недорага набываю. Нехта адмаўляецца, таму што ён дарагі мастак. Няхай. Я сваю калекцыю не прадаю. На мой погляд, мастак — гэта яблыня. У нас цэлы сад яблынь. Адна дае салодкія яблыкі, другая кіслыя, трэцяя гаркаватыя. Адны можна з'есці, другія захаваць, з трэціх можна зрабіць віно. Напрыклад, у нас ёсць Рыгор Несцераў — супермастак. Не народны, але чалавек, які ўвайшоў у 1000 найлепшых мастакоў канца XX стагоддзя, у сусветную калекцыю. Чаму яго не купляць? Я, мастак-дылетант, таксама туды ўвайшоў. З Беларусі ўсяго 11 чалавек. Чаму іх не збіраць? І добра, што знаходзяцца людзі і арганізацыі, якія гэта збіраюць і маюць магчымасць прадставіць. Людзі папаўняюць культурную прастору Беларусі. Я, на жаль, такой магчымасці не маю (у мяне няма спонсараў і няма столькі грошай). Але выставы час ад часу бываюць з удзелам твораў з маёй калекцыі, у прыватнасці ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва.

Калекцыянер, куратар праекта «АртДайджэст-Беларусь» Таццяна МАРКІНА:

— Я пакуль далёкая ад таго, каб мая калекцыя стала часткай беларускай спадчыны. Але я са сваёй калекцыяй удзельнічала ў культурным жыцці Мінска. Гаспадыня галерэі «Кніжны салон» Аля Зміёва запрасіла мяне аднойчы на тэматычную выставу, прысвечаную Ван Гогу. Я ўзгадала, што ў маладога беларускага мастака Алега Касцючэнкі ёсць карціна, «Люлька Ван Гога». Паехала да яго ў майстэрню, каб папрасіць напракат. Ён сказаў: «Хочаш — купляй». Прыйшлося купіць. Але запрасіла яго ў салон, дзе праца была прадстаўлена. Тады мне прыйшла думка: чаму б не зрабіць іншы праект на тэму інтэрпрэтацый вялікіх мастакоў? Зрабіла выставу з 12 беларускімі мастакамі ў галерэі Шчамялёва, яна мела працяг у Гомелі ў галерэі Вашчанкі.

В. БАБАРЫКА: — Любы калекцыянер мае на ўвазе, каб яго калекцыя расла ў кошце, каб яе прадаваць. Ёсць такая катэгорыя, як час: ён заўсёды працуе на калекцыянера. Мы купляем і экспануем тое, чаго не было. Але ж і сучасным мастацтвам займаецца безліч людзей. Чаму гэта не прасоўваецца? Акрамя часу, ёсць яшчэ адзін фактар, які ўплывае на кошт: прасоўванне і прызнанне калекцыі ці твораў знешнім бокам. У гэтым кантэксце мне дзіўнае беларускае калекцыянаванне: чаму не працаваць на вядомасць сваёй калекцыі і наданне ёй дадатковай каштоўнасці?

У рамках арт-праекта «Асенні салон» мы спадзяёмся на стымуляцыю інвестыцыйнай прывабнасці беларускіх сучасных мастакоў. Мы робім гэты крок і імкнёмся высветліць: хто на рынку Беларусі цікавы? Як спытаць — дык талентаў у нас шмат. Але цяпер мы спрабуем знайсці мастакоў, таленавітых з пункту гледжання незалежнага меркавання. Мы нездарма сюды прыцягнулі каштоўныя рэчы з нашай калекцыі: тую самую вішаньку, на якую прыйдуць. Але большая частка — моладзь, гэта 40 мастакоў. І кажуць, што 13 твораў ужо прададзена. Значыць, цікава, хоць прынцыпы адбору можна і ўдасканаліць. Усе мы розныя, але можам аб'яднаць высілкі. Толькі трэба пераадолець лакальнасць — гэта наша бяда. Я за тое, каб не лакалізаваць свае калекцыі. Цяпер у нас ёсць тры кампаненты: прыватны калекцыянер, які наталяецца працамі, таму што ўсё жыццё іх збіраў, арт-дылер, які павінен займацца прасоўваннем мастакоў, і тыя людзі, якім трэба патраціць грошы, але яны не ведаюць, як гэта лепш зрабіць.

Скульптар Канстанцін СЕЛІХАНАЎ:

— Я думаю, што ў сілу гістарычных ці іншых прычын нашы калекцыянеры, нават калі яны ёсць, робяць усё для таго, каб ніхто пра іх ніколі не даведаўся. Але калекцыянеры маюць свой погляд на рэчы ў залежнасці ад шмат якіх абставін. Бываюць нечакана цікавыя ініцыятывы, як, напрыклад, набываць і паказваць найлепшыя работы народных мастакоў Беларусі, што зрабілі ў галерэі «Дом карцін». Аказваецца, нашы народныя мастакі даволі добра пісалі ў 50-я, 60-я гады. Што перашкаджала нашым тайным «ценевікам» купіць і выставіць гэта? Таксама прычына ў менталітэце, закладзеным пры Савецкім Саюзе. Чаму Сяроў ці Шышкін тады не каштавалі столькі, як цяпер? Адсутнасць рынку ў Савецкім Саюзе не давала магчымасцяў пра гэтых мастакоў даведацца ў свеце. Таму мы ведаем толькі тых, хто з'ехаў. Астатнія забытыя. У нас жа зусім не факт, што пасля смерці мастак будзе славутым. А што адбываецца са спадчынай мастакоў, якія паміраюць? У лепшым выпадку яна не знішчаецца...

Мастацтвазнаўца, дырэктар галерэі «Дом карцін» Ларыса БОРТНІК:

— Калекцыі бываюць вельмі рознымі. Бессістэмныя — для таго, каб парадавацца. Тэматычныя. Ці калі збіральнік выстаўляе на публіку як агульную спадчыну. Але можна пайсці і далей, на больш шырокую прастору, за мяжу. У нас усе топчуцца на першым узроўні. У рэдкіх выпадках пачынаюць паказваць. І тады адкрываюцца дзіўныя рэчы. Сёння, калі мы выпусцілі калекцыю народных мастакоў, я зразумела, што ў той дзяржаве быў нехта, хто даваў званні за творчае аблічча. З 19 мастакоў, якіх мы паказалі (а ў нас іх 31), няма падобных адзін да аднаго. Але калі мастак сышоў, на яго творчасць можна паглядзець з вышыні, лягчэй вызначыць, варта яго набываць ці не. Сучасным творцам меней увагі. Нехта ставіць на сучасных, але гэта рызыка, калі гаворка пра сур'ёзныя грошы. У нас шмат прадпрыемстваў збіралі калекцыі, а потым не ведалі, што з гэтым рабіць. Гэтая выстава праграмная: акрамя таго, што ёсць перліны, якія рассыпаліся па свеце, яшчэ ідзе падтрымка маладых.

В. БАБАРЫКА: — Самае важнае — зрабіць крок ад лакальнага рынку да знешняга. Мне здаецца часам, што моладзь не верыць у перспектыву. Страшна не тое, што яны без веры гатовыя з'язджаць: страшна тое, што, не з'язджаючы, пагаджаюцца, што нічога немагчыма зрабіць. Таму вельмі хочацца абудзіць рынак продажаў, каб мастакі паверылі, што яны цікавыя. Трэцяя: з дапамогай міжнароднага журы вызначыць мастакоў, якіх можна было б прасоўваць далей.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ «ТэАрт»

МАГЧЫМА

Вобраз сучаснай Беларусі ў тэатры

Што за... Тэатр без сюжэта і нейкай выразнай гісторыі? У ім можа не быць нейкага героя, вакол якога закручваецца інтрыга, ды і інтрыга не абавязковая, але пры гэтым некалькі фіналаў (ці варта лічыць?), ды і тэкст можа быць ці не быць галоўным кампанентам, таму што асобным выказваннем з'яўляецца форма. Постдраматычны тэатр — так гэта назваў нямецкі даследчык Ханс-Ціс Леман напрыканцы XX стагоддзя, калі гэтая з'ява ў заходняй тэатральнай практыцы стала звычайнай, яе замацавалі нават асобным тэрмінам. Не проста плынь, а новая тэатральная рэчаіснасць. Тэатр жа — люстэрка жыцця, выяўляе яго імклівасць, уплыў тэхнікі, асаблівы эмацыйны фон. Аднак былі дзесяцігоддзі, калі такі тэатр лічыўся эксперыментам. У нас дык лічыцца дагэтуль, у другім дзесяцігоддзі XXI стагоддзя.

Сцэна са спектакля «Мабыць?» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

Тое, з чаго сёлета складзена праграма Belarus Open у рамках міжнароднага тэатральнага форуму «ТэАрт», — наша наватарскае. Кожную пастаноўку можна разглядаць у кантэксце таго, што прывозілі на фестываль госці — так і імкнуліся паказаць тэатральную Беларусь арганізатары форуму. Яны маюць рацыю.

Асобныя спробы ці пастаноўкі ствараліся ў Беларусі ў падобнай стылістыцы ўжо на мяжы стагоддзяў, праўда, адзінкавыя. У асноўным тымі рэжысёрамі, якія былі ў кантэксце развіцця сусветнага тэатра, ездзілі на фестывалі ў Еўропу, а потым стваралі спектаклі, «фестывальныя» (як сказалі б аматары кіно). Праўда, часта насуперак чаканням айчынных гледачоў, якія ў большасці сваёй працягваюць жыць у кантэксце тэатра драматычнага, дзе ўсё зразумела, па паліцах, пажадана з прыгожымі касцюмамі, без залішніх разумнасцяў ці абстракцый — з імі ж не разняволішся, увесь час сядзі і нешта думай, выводзь... Сам.

Што за?.. Тэкст кавалкамі, асобнымі маналогамі, фразамі. Нібыта падслуханымі ў жыцці — на вуліцы, па тэлевізары ці яшчэ дзе. Вонкавы вобраз — нейкая ілюзія. Нават класіку не пазнаць — за што ж так з нашым гледачом, шчырым і ўдзячным па сутнасці? Ён жа можа не вытрыма-а-аць. Не, даказана: наш перажыве, застануцца самыя цікаўныя, хто ў пошуку. Чулыя і адкрытыя да новых формаў тэатра, адпаведна, да новых формаў жыцця. Таму што ў сучасным тэатры (дзе ўжо праяўляе сябе постпост эстэтыка) прастора настолькі гнуткая, што лішнія дэкарацыі могуць толькі замінаць эмацыянальнаму эфекту, які дасягаецца не толькі словамі, але рухамі, святлом, музыкай (усё часцей жывой), ці нават відэарадам і іншымі тэхнічнымі «наваротамі». Форма — гэта своеасаблівы тэст на адносіны да рэчаіснасці, з аднаго боку. А з другога, і гэта не аксіёма, калі гаворка пра Беларусь. Але дакладна: тыя, каго ў нас прыцягвае форма, яшчэ больш схільныя шукаць у ёй сэнс.

Калі паглядзець спектаклі запрошаныя — то відавочна, што такі глядач у нас ёсць, ён хоча іншага. У яго ёсць шанц — наперадзе тыдзень, калі яшчэ можна паглядзець спектаклі «ТэАрта». І будзе старацца. Таму што сярод беларускай тэатральнай рэчаіснасці пануе ў асноўным рэпертуарны тэатр, больш традыцыйны — і гэта таксама наша адлюстраванне жыцця праз сцэну. Традыцыйны драматычны, у якім акцёры разыгрываюць уцямную гісторыю, — наша ўсё. Ён такі жывучы і запатрабаваны, таму што адпавядае сутнасці беларускага жыцця з яго кансерватызмам, калі большасць пагаджаецца з пратактнымі і праверанымі падыходамі да ўсяго.

Але не значыць, што няма ці не прапануецца альтэрнатывы, у якой рэжысёр мае права быць розным (рамкі рамкамі, але ж мастацтва заўсёды імкнулася выйсці за іх). Такі, як Аляксей Ляляўскі ці Яўген Карняг, Вячаслаў Іназемцаў ці Таццяна Траяновіч, запрошаныя Саўлюс Варнас (які ў Беларусі гне сваю лінію) і Іскандэр Сакаеў (не прагінаецца пад шырокія густы), Аляксандр Марчанка ці Вольга Лабоўкіна і іншыя. Ужо не адзінкі. Рэжысёры ствараюць тэатр у залежнасці ад жыццёвага пункта, у якім знаходзіцца грамадства, якое яны прадстаўляюць. А яно ўсё ж у руху (хуткасць — іншае пытанне). З гэтага пункту гледжання і трэба ставіцца да тых прац, якія былі адабраныя ў беларускую праграму, пра якую гаворка будзе ісці ў наступным выпуску. Таму што бываюць нагоды дзівіцца тым сілам, якія праяўляюцца ў беларускім тэатры і даюць гледачу права выбару, што ўжо значна. Глядач можа не разумець, навошта яму гэта вось такое, але ў яго з'яўляецца шанц аднойчы трапіць на нейкі такі спектакль, калі захочацца сказаць: «Што за!..» І ўбачыць сваю краіну ў тэатры іншымі вачыма.

Ларыса ЦІМОШЫК
tsimoshyk@zviazda.by

■ Кінакрокі

ЗБЯРЫ МЯНЕ З САБОЮ

Вобраз нашага кіно вызначаецца ўвосень

У найбліжэйшы час у нас ёсць дзве выдатныя магчымасці ацаніць дасягненні беларускіх кінатворцаў. Акрамя нацыянальнага конкурсу мінскага кінафестывалю «Лістапад», гэта Варшаўскі кінафестываль Bulbamovie, паказы якога ў межах з 23 да 25 кастрычніка пройдуць у Варшаве, Кракаве і ўпершыню ў Мінску. «Бульбамуві», у параўнанні са сваім калегам, мае багацейшую гісторыю — вобраз беларускага кіно сёлета прадставіцца пяты раз. Тут паказваецца поўны і кароткі метр, іграваe і неігравое, незалежнае і «беларусьфільмаўскае» кіно. Сёлета конкурсная праграма адбіралася з 47 заявак і склалася ў выніку з адзінаццаці кароткаметражных фільмаў.

Акрамя варшаўскага кінатэатра Muranow, яна будзе паказана 24 кастрычніка ў мінскім Цэнтры сучасных мастацтваў (пазаконкурсная праграма будзе дэманстравацца яшчэ ў Кракаве). У параўнанні з мінулымі фестывалямі праграма выглядае менш насычанай, што тлумачыцца фінансавым складнікам. А калі адысці ад тэхналагічных і лічбавых характарыстык, гэта кіно — так ці інакш голас блізкіх нам людзей, што адлюстроўвае пошукі і праблемы сучаснікаў. «Бульбамуві» — цэлы кінафестываль з нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй.

«Андрэй Кудзіненка яшчэ ў 2011 годзе анансаваў наш першы фестываль кароткім і трапным азначэннем, што «беларускае кіно — гэта апартунізм, містыфікацыя і палёты ў космас», — кажа **заснавальнік і арганізатар фестывалю Януш ГАЎРЫЛЮК.** — Але наш форум цікавіць больш «экалагічная» вытворчасць, аўтарскі падыход да рэалізацыі фільмаў. На жаль, аўтараў, якім ёсць што сказаць, мала. Яны таксама нечакана знікаюць, як і з'яўляюцца, але працэс пайшоў і яго не спыніць. Каб трапіць у конкурс, трэба проста быць беларусам. Маладым кіношнікам трэба ездзіць па свеце, глядзець і «нюхаць». Да таго ж аўтарскае кіно — найлепшы сродак, каб замежнікі зразумелі той кавалак зямлі, што ляжыць паміж Польшчай і Расіяй».

Штогод «Бульбамуві» даказвае (чым робіць адказную справу) адну важную рэч — беларускаму кінематографу ёсць што паказаць. І гэта дасягаецца разам з іншымі місіямі фестывалю, якія спадар Януш акрэслівае адназначна: гэта прамоцыя беларускага кіно ў Польшчы, дзякуючы чаму палякі лепш ведаюць нашу краіну, і падтрымка маладых аўтараў. «Гэта патрэбна тым, хто хоча выклікаць у Беларусі Новую хвалю, а палякі могуць падзяліцца сваім досведам. У нашых планах шэраг польска-беларускіх воркшопаў».

У сёлетнім фестывалі тры з адзінаццаці конкурсных карцін — дакументальныя. Гэта «Клапоцкі» Аляксандра Міхалковіча, пра аскета-фатографа з правінцыйнага горада, «Пасха Хрыста» Дар'і Юркевіч пра адзначэнне штогадовага хрысціянскага свята ў царкве (у мінулым годзе карціна рэжысёркі «Баба, Ваня і каза» атрымала на фестывалі «Сярэбраную бульбіну») і «Беларускія гульні» Івана Куракевіча.

З адной з іграваых карцін конкурсу чытачы «Звязды» ўжо знаёмыя — гэта фільм «Пугач» Сяргея Каласоўскага, пяшчотная адсылка да дзяцінства з гадзіннікам «Мантана» і жуйкамі «Турба». Ён паказваўся таксама на апошнім адкрытым фестывалі кіно краін СНД, Літвы, Латвіі і Эстоніі «Кінашок» у Анапе. Яшчэ адна карціна — «Адной крыві» Мітрыя Сямёнава-Алейнікава пра двух братоў з рознымі поглядамі на жыццё — атрымала Гран-пры на міжнародным фестывалі фільмаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы Let's Cee ў Вене, дзе ўдзельнічала ў конкурсе разам з 118 іншымі кароткаметражкамі. Размова двух хлопцаў пра сэнс чалавечага існавання адлюстравана ў карціне «Вірус» Васіля Цыбулькі; адносіны любоўнага трохкутніка ў карціне «Музыка ў сярэдзіне» Андрэя Кашперскага і Нэлы Васілеўскай; тэма самагубства ў фільме «Апошні дзень дурнога жыцця» Сяргея Філатава; спроба выявіць вобраз беларуса і Мінска ў стужцы «Амерыкан бой» Мікіты Лаўрэцкага; вобраз краіны, які школьнік спрабуе знайсці на вуліцы, у карціне «Беларусь, якая» Влады Сянковай і Святланы Сакалоўскай; жыхар шматкватэрнага дома, што скардзіцца на кансьержа ў ЖЭС у фільме «Кансьерж» Робэрта Сенекі.

Пазаконкурсная праграма складаецца са свайго роду ўжо пераможцаў. Сёлета «Бульбамуві» пакажа трыумфальны фільм «Скрыжаванне» Настассі Мірашнічэнкі і агульнабеларускі праект «Хранатоп», які ствараўся арт-групай» пад кіраўніцтвам Андрэя Кудзіненкі. Апошняя карціна была ўзнагароджана галоўным прызам у конкурсе кінаальманахаў «Амнібус» на «Кінашоку». У пазаконкурсную праграму таксама ўваходзяць два фільмы маладога рэжысёра Мікіты Лаўрэцкага — «Паэзія» і «Амерыкан бой», італьянская і нямецкая дакументальныя стужкі «Made in BY» і «Касмічны параход з белай капусты» як заходнееўрапейскі погляд на нашу краіну; украінскі фільм «Міна» (у стварэнні карціны ўдзельнічала беларуска Саша Мяснікова) і тры фільмы — пераможцы сёлетняга фестывалю.

«Бульбамуві» адзначае ў гэтым годзе маленькі юбілей. Кожны год фестываль складае праграмы з таго, што створана беларусамі, таму да Януша Гаўрылюка ўзнікла лагічнае пытанне: ці апраўдвае чаканні ўзровень фільмаў?

«Калі параўноўваць з сітуацыяй першых трох гадоў, калі была чорная дзірка, цяпер час ад часу відаць ясныя поясы. Творцы вярнуліся з космасу і бяруць тэмы, што пад рукой, таму карцінка, гук і вобразы не хлусяць. Я спадзяваўся, што сёлета будуць толькі перлы, але прыйшлося расчаравацца. Часам людзі дасылаюць выпадковыя карціны (з абавязкова манументальнай музыкай), някепскія рэпартажы, але яны падыходзяць для тэлебачання, не для фестывалю аўтарскага кіно. Завальваюць нас дакументальнымі фільмамі пра беларускую вёску: конь, карова, гусі і дзед, які ў камеру расказвае пра тое, як раней было... Па заяўках відаць, што людзі мала глядзяць, хоць гэта бясплатная навука, а трэба ведаць класічныя і сучасныя фільмы, каб ствараць нешта арыгінальнае. Радуе, што ёсць аўтары, якія з кожным годам дасылаюць усё больш цікавыя фільмы, напрыклад Роберт Сенека пачынаў з фільмавага скетча, а сёлета даслаў сучасную гумарыстычную кароткаметражу з невыпадковымі акцёрамі».

«Андрэй Кудзіненка яшчэ ў 2011 годзе анансаваў наш першы фестываль кароткім і трапным азначэннем, што «беларускае кіно — гэта апартунізм, містыфікацыя і палёты ў космас».

Фільм «Касмічны параход з белай капусты» з пазаконкурснай праграмы.

Так ці інакш, «чыстыя» фестывальныя праграмы могуць прадставіць уласны твар беларускага кіно: «Пошук гэтага твару адбываецца ўвесь час. Ён ужо недзе ёсць, але ніхто не ведае, дзе. Я перакананы, што ён складаецца з твораў незалежных аўтараў, а не ў архаічнай нацыянальнай кінаіндустрыі. Каб вызначыць твар нашага кіно, павінна ўзнікнуць установа кшталту «Беларускага інстытута кінамастацтва», якая будзе фінансавацца з дзяржаўных сродкаў і займацца выключна кінаадукацыяй, прамоцыяй беларускіх фільмаў у свеце і выдаткоўваннем грошай на аўтарскае кіно».

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by